Шыфр:______________________

Колькасць балаў:______________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі

________________ А.С. Сідарэн

«14» ________________ 2017 год

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Гомель, 2(*

**10 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Варыянт I**

**Заданне 1.** З прапанаваных ніжэй гукаў (гукавых спалучэнняў) выберыце тыя, ш адпаведнасці з правіламі літаратурнага вымаўлення, павінны вымаўляцца ў прыведзен табліцы словах у месцах пропуску. Нумары выбраных гукаў (гукавых спалучэнняў) упіш ў табліцу насупраць адпаведных ім слоў.

Гукі і гукавыя спалучэнні:

1 – [*і*],
2 – [*ы*],
3 – [*й*],
4 – [*йі*],
5 – [*ый*].

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожнае правільнае раш

| | | |
|---|---|---|
| *за[ ]скрыцца* | | *пра[ ]гравальнік* |
| *раз[ ]сціся* | | *дэз[ ]нфармацыя* |
| *звыш[ ]дэйны* | | *пр[ ]дуць* |
| *аб[ ]лгаць* | | *спец[ ]нструктаж* |

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай фо складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам *сэрца*, запісаўшы іх у правым слупку таб насупраць адпаведных для ўстойлівых выразаў значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў:

*а, абліваца, вусны* (назоўнік), *з, з, заміранне, зваліцца, камень, кроў, лёд, мёд, на* (або *ў*), *на, на, пакласці, рука, як (нібы, быццам)*.

**Заўвага**: калі ў складзе фразеалагізма ёсць дзеепрыметнік або дзеепрыслоўе, то для іх у якасці пачатковай формы пададзены інфінітыў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | | |
|---|---|---|
| **1.** | 'з усёй шчырасцю, праўдзіва' | |
| **2.** | 'хто-небудзь знешне ветлівы, далікатны, а спадцішка прычыняе шкоду, непрыемнасці' | |
| **3.** | 'хто-небудзь адчуў палёгку, пазбавіўся ад якіх-небудзь клопатаў, перажыванняў' | |
| **4.** | 'хто-небудзь зазнае пачуццё глыбокай спагады, жалю; каму-небудзь невыносна цяжка, вельмі тужліва' | |
| **5.** | 'адчуваючы моцнае хваляванне, трывогу (чакаць, сачыць, глядзець і пад.' | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

В церковь можно было проникнуть через подвал – это Семка знал с детства, не раз лазил туда с ребятней. Ход в подвал, некогда закрываемый створчатой дверью, полуобвалился, зарос бурьяном… Семка с трудом протиснулся в щель и – где на четвереньках, где согнувшись в три погибели – вошел в придел. Просторно, гулко в церкви… Легкий ветерок чуть шевелил отставший, вислый лист железа на маковке, и шорох тот, едва слышный на улице, здесь звучал громко, тревожно *(По В. М. Шукшину)*.



| | |
|---|---|
| 1. Назва цвёрдай формы верша, выкарыстанай М. Мятліцкім. Абгрунтуйце свой адказ. | |
| 2. Сродак выразнасці, выкарыстаны ў вылучаным курсівам словазлучэнні. | |
| 3. Факт з гісторыі Беларусі, які адлюстраваны ў вершы. | |

13. «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага
14. «Песняру» Максіма Багдановіча
15. «Гарбуз» Алеся Звонака

**Заданне 9.** Прачытайце вядомыя фрагменты з твораў беларускіх пісьменнікаў. Многія з гэтых цытат сталі крылатымі выразамі. Запішыце ў табліцы аўтара і назву працытаванага твора.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Цытата | Аўтар | Твор |
|---|---|---|
| На беларускую дзяўчыну,<br>Калі тут праўду ёй аддаць,<br>Ніхто йшчэ каменем не кінуў<br>І не паважыцца кідаць. | | |
| О, край родны, край прыгожы!<br>Мілы кут маіх дзядоў! | | |
| Каб любіць Беларусь нашу мілую,<br>Трэба ў розных краях пабываць. | | |
| Веру, братцы: людзьмі станем,<br>Хутка скончым мы свой сон… | | |
| <…> Так рупная пчала<br>Умее ў соты мёд зыбраць і з горкіх кветак… | | |

**Заданне 10.** Прачытайце верш Міколы Мятліцкага і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Ступаю ў лес – падсушаным сіўцом
Хрусціць дарога спудна і сіроча.
***Хваін сцяна***, як тая патароча,
Гарбаціцца за бліжнім азярцом.

Цячэ рака Жыцця. Яе плыўцом
Душа пачуць сябе ніяк не хоча,
Бо ветру ўзвей пагрозліва шапоча,
Нібыта Божы свет – перад канцом.

І шнарыць смерць па выселеных хатах.
Насенне зла схавана ў чорных спратах,
Чакае зноў сусветнага сяйва.

Рыпіць напята лёсу калымага.
Глядзіць сляпое вока саркафага
Удалеч з-пад графітнага брыва.



---

**Заданне 4.** Вам добра вядомы загадкі для дзяцей, пабудаваныя на аманіміі слоў. Вось, напрыклад, загадка С. Шах: *«Я – адзін з напрамкаў свету – займеў загадкавую мэту сярэдзінаю ночы стаць, каб сваю назву пацвярджаць»*, адгадкамі да якой будуць аманімічныя словы поўнач – напрамак свету і поўнач – сярэдзіна ночы. А ці залежыць ад значэння склад слова падобных адзінак?

Вызначце, з якіх марфем складаюцца выдзеленыя ў словазлучэннях словы.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (0,5 бала за кожнае правільна разабранае слова).

| Словазлучэнне | Разбор слова па саставе | Словазлучэнне | Разбор слова па саставе |
|---|---|---|---|
| Узор: ***поўнач** краіны* | *поўнач-□* | *зорная **поўнач*** | *поў-нач-□* |
| брапіраваная **танкетка** | | **танкетка** туфля | |
| **спрагаць** дзеясловы | | **спрагаць** коней | |
| **уклад** жыцця | | **уклад** у навуку | |
| **вырываць** траву | | **вырываць** яму | |
| **палка** гаварыць | | зламаная **палка** | |

**Заданне 5.** Уявіце, што падчас вашай працы з электронным варыянтам «Граматычнага слоўніка дзеяслова» адбыўся збой у праграме. Аднавіце граматычныя формы дзеясловаў у слоўнікавых артыкулах.

**Узор:**

**высушыць** зак., *што* высушу, высушыш, высушыць, высушым, высушыце, высушаць; высушы, ____________ (?); высушыў, высушыла, высушылі; высушаны; ____________ (?)

**высушыць** зак., *што* высушу, высушыш, высушыць, высушым, высушыце, высушаць; высушы, **высушыце**; высушыў, высушыла, высушылі; высушаны; **высушыўшы.**

*Максімальная колькасць балаў –4* (0,5 бала за кожную правільна запісаную форму).

**змалоць** *зак., што* змялю, змелеш, змеле, змелем, змелеце, змелюць; змялі, ____________ (?); змалоў, змалола, змалолі; ____________ (?); змалоўшы;

**брысці** *незак.* брыду, брыдзеш, брыдзе, брыдзём, ____________ (?), брыдуць; брыдзі, брыдзіце; брыў, брыла, брыло, брылі; ____________ (?);

**смяяцца** *незак.* смяюся, смяешся, смяецца, смяёмся, ____________ (?), смяюцца; смейся, смейцеся; смяяўся, смяялася, смяяліся; ____________ (?);

**абысці** *зак., каго-што* абыду, абыдзеш, абыдзе, абыдзем, абыдзеце, абыдуць; ____________ (?), абыдзіце; абышоў, абышла, абышло, абышлі; ____________ (?); абышоўшы.

**Заданне 6.** Вызначце, якой часцінай мовы і якім членам сказа з'яўляецца слова ***дарма***, падбярыце да яго сінонім.

*Максімальная колькасць балаў - 6* (0,5 бала за вызначэнне часціны мовы, 0,5 бала за вызначэнне члена сказа і 0,5 бала за падбор сіноніма).

1. ***Дарма*** чакаў, пытаўся ў варты княжай…(*А. Міцкевіч*).
2. Баішча – будзе ёй адплата – чакаць дабра з таго ***дарма*** (*Я. Колас*).
3. У родным месцы, ***дарма*** што разбураным, ты залечыш свае раны (*У. Глыбінны*).
4. – Кара павінна збыцца, каб усе яны памяталі, што замах на белага не пройдзе ***дарма*** (*Я. Маўр*).

| Часціна мовы | Член сказа | Сінонім |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |

**Заданне 7.** Уважліва прачытайце. Правядзіце неабходны аналіз, адкажыце на пытанні.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

(1) Перад світаннем, калі патухаюць зоры, калі неба робіцца бледна-зялёным, як недаспелае яблыка, і над ляснымі азёрамі разгараецца адзіная калючая зорка, – з лясных зараснікаў выходзіць да возера прыгожы гарбаносы звер. (2) Доўгімі стальнымі нагамі ён асцярожна ступае па травах, і ніводная ламачына не хрумсне пад яго капытом. (3) Звер асцярожна пасоўваецца наперад, і, быццам падпарадкоўваючыся невядомай і бязгучнай мове, з зараснікаў выплывае за ім другі звер, меншы. (4) Яны падыходзяць да возера і, прымінаючы жоўтыя касачы, пачынаюць асцярожна цягнуць ваду праз ружовыя мяккія губы. (5) Ласянё праганяе смагу хутчэй і пачынае дурэць: торкае маці храпай пад пахвіну. (6) Яму добра і весела, ён чухае задняй ножкай за вухам, глядзіць на свет добрымі, вялікімі, як слівы, вачыма (У. Караткевіч: *Лясная гісторыя*).

1) Вызначце і запішыце від сувязі ў тэксце. Адказ абгрунтуйце.

______________________________

2) Пры дапамозе якіх моўных сродкаў звязаны сказы ў тэксце?

______________________________



3) Знайдзіце і выпішыце з тэксту слова, якое не адпавядае граматычным нормам сучаснай беларускай мовы. Растлумачце характар памылкі.

______________________________

4) Дайце агульную характарыстыку першаму сказу ў тэксце.

______________________________

5) Назавіце ўсе формы ўскладнення сказаў у тэксце.

______________________________

**Заданне 8.** У адпаведнай графе табліцы пастаўце нумар прыкладу, які адпавядае пэўнаму жанраваму абазначэнню.

**Увага!** Сярод прыкладаў ёсць творы, якія не адпавядаюць ніводнаму з названых у табліцы жанраў. Правільных адказаў павінна быць толькі дванаццаць.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Жанр | Нумар прыкладу |
|---|---|
| Літаратурная казка | |
| Апавяданне | |
| Аповесць | |
| Байка | |
| Паэма | |

**Прыклады:**

1. «Лебядзіны скіт» Уладзіміра Караткевіча
2. «Сябры» Алены Васілевіч
3. «Незагойная рана» Васіля Быкава
4. «Дзяльба кабанчыка» Віктара Карамазава
5. «Насцечка» Кузьмы Чорнага
6. «Чужое багацце» Георгія Марчука
7. «Малпін жарт» Уладзіміра Корбана
8. «Паўлінка» Янкі Купалы
9. «Алені» Івана Пташнікава
10. «Сірочы хлеб» Янкі Брыля
11. «Проня» Аляксея Пысіна
12. «Кепска будзе!» Францішка Багушэвіча